# Весці

Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта

1996 № 2 (8)

Часопіс выдаецца з чэрвеня 1994 г.
Выходзіць чатыры разы ў год

## Змест

### Педагогіка

*Кулінковіч К. А.* Метадалагічныя праблемы гісторыі педагогікі ........ 3

*Цыркун І. І.* Крыніцы і спосабы стварэння навуковага абгрунтавання дыдактычнага наваўвядзення ........ 7

*Краўчэня Э. М., Абрагімовіч А. П.* Рэзервы павышэння эфектыўнасці навучальнага працэсу ........ 12

*Палупанава А. Р.* Рэалізацыя прынцыпу зваротнай сувязі пры праверцы творчых пісьмовых прац ........ 15

*Гиза Т. (Польша)* Подготовка студентов педагогических институтов к профессиональной работе ........ 18

*Дружка В. (Польша)* Педагогическая сознательность у молодых учителей ........ 21

### Псіхалогія

*Гадзілія А. М.* Успрыманне лірычнага вобраза і эмацыянальнае развіццё асобы ........ 25

### Паліталогія

*Апімах М. А., Цярпіцкі Э. К.* Асаблівасці сучаснай партыйнай структуралізацыі ........ 30

*Пайлава Н. В., Ракіцкая Л. М.* Станаўленне і функцыянаванне шматпартыйнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь ........ 34

*Зенчанка В. А.* Асаблівасці палітычнага лідэрства ў Рэспубліцы Беларусь ........ 38

*Шуміла Н. П.* Палітыка і мастацтва ........ 42

### Мовазнаўства

*Мілашэўская А. А.* Няўласна-простая мова як састаўная частка складаназалежных сказаў (на матэрыяле трылогіі Якуба Коласа "На ростанях") ........ 46

*Цялкова В. У.* З гісторыі вывучэння беларускай гідранімії ........ 50

*Ушева В. В.* К вопросу о категориальных особенностях перифразы ........ 56

### Біялогія

*Федарук А. Т.* Фенетыка насаджэнняў дрэўных відаў у Беларусі ........ 61

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

АРК

## ЛІТАРАТУРА

1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Мн.,1994.
2. Беларусістыка: Палітычныя і грамадска-палітычныя рухі Белару[...] Мн.,1993.
3. Баранова Е.В. Политические партии и проблемы модернизац[...] власти в Республике Беларусь. Мн.,1995.
4. Политология / Под ред. В.А.Бобкова. Мн.,1995.
5. Станаўленне шматпартыйнай сістэмы ў Беларусі /Пад рэ[...] В.Карбалевіча. Мн.,1994.

## SUMMARY

*The authors attempt to analyse some peculiar features to th[...] process multiparty political system formation in the Republic o[...] Belarus.*

УДК 321.01. 9.5(476)

*В. А. Зенчанка*

# Асаблівасці палітычнага лідэрства ў Рэспубліцы Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Цікавасць да праблемы лідэрства ўзнікла ў старажытныя часы. На працягу стагоддзяў гісторыкі, філосафы, сацыёлагі, псіхолагі і іншыя прадстаўнікі сацыяльна—гуманітарных навук імкнуліся даследаваць гэты складаны і важны сацыяльны феномен, распрацоўвал[...] розныя яго аспекты: прыроду і псіхалогію, тыпалогію, пытанні ўзаемаадносін лідэра і мас, механізмы функцыянавання і г.д.

Адзначым: існаванне і функцыянаванне лідэрства дэтэрмінавана аб'ектыўнымі патрэбнасцямі сацыяльнага жыцця і ўласціва для ўсі[...] форм чалавечых супольнасцяў. Гэта абумоўленасць тлумачыцца тым, што супольнасцям, грамадству ў цэлым патрэбен механізм фарміравання, арганізацыі і інтэграцыі групавой дзейнасці людзей з наданнем ёй пэўнай накіраванасці. Лідэр (англ.—вядучы), выступаючы аўтарытэтным членам арганізацыі або сацыяльнай групы, сваім уплывам паспяхова выконвае названыя функцыі ў грамадстве. Сіла лідэра — у здольнасці выразіць і рэалізаваць карэнныя інтарэсы сацыяльных і палітычных сіл, якія ён прадстаўляе.

Палітычнае лідэрства можа ажыццяўляцца ў міжнародным, нацыянальным маштабах або на ўзроўні рэгіёна. У рамках краіны да палітычных лідэраў звычайна адносяць кіраўнікоў дзяржавы, палітычных партый, грамадска-палітычных арганізацый і рухаў. У апошні час сэнсавыя межы дадзеных паняццяў значна пашыраны. Зараз у кола палітычных лідэраў уваходзяць таксама папулярныя і ўплывовыя ўдзельнікі палітычнага жыцця, рэгіянальныя палітычныя кіраўнікі, якія дзейнічаюць па-наватарску і незалежна.

Навуковае тлумачэнне палітычнага лідэрства патрабуе разумення яго зместу на розных этапах развіцця грамадства. Прырода лідэрства і яго асаблівасці вызначаюцца грамадска-палітычным ладам, пануючай ідэалогіяй, нацыянальнымі і гістарычнымі традыцыямі, узроўнем агульнай і палітычнай культуры народа, яго палітычнай свядомасці. Улік гэтых фактараў дазваляе больш дасканала прааналізаваць асаблівасці палітычнага лідэрства ў Рэспубліцы Беларусь.

Разбурэнне каманднa-адміністрацыйнай сістэмы, працэсы дэмакратызацыі ў нашай рэспубліцы заканамерна прывялі да палітычнага плюралізму і шматпартыйнасці, фракцыйнай дзейнасці ўнутры парламента і партый, палітычнага і інтэлектуальнага спаборніцтва людзей, якія ўвасабляюць тыя ці іншыя ідэі і інтарэсы. Вынікам гэтых працэсаў з'явіўся пераход ад монацэнтрычнай сістэмы лідэрства, калі камуністычная партыя адна мела права падбіраць кіраўнікоў на пасады, да поліцэнтрычнай, якая прадугледжвае мноства суб'ектаў палітычнага лідэрства розных тыпаў і ўзроўняў. Узніклі новыя магчымасці вылучэння ў палітычныя лідэры праз дзейнасць у нанава створаных партыях і рухах, барацьбу за прэзідэнцкую пасаду і месца ў парламенце, дзейнасць у якасці дэпутатаў. Новая сістэма дазволіла праявіць сябе ў якасці ўплывовых палітычных дзеячаў рэспублікі А.Лукашэнку, З.Пазняку, С.Шушкевічу, С.Шарэцкаму, А.Дабравольскаму і іншым раней мала вядомым у палітыцы людзям.

Аднак станаўленне разгорнутай і адладжанай сістэмы палітычнага лідэрства — складаны, працяглы і супярэчлівы працэс. Нягледзячы на тое, што цяпер у Беларусі існуе 690 грамадскіх аб'яднанняў [1, [illegible]], 36 афіцыйна зарэгістраваных партый [2], фарміраванне паўнацэннай шматпартыйнай сістэмы, плюралізму ў грамадска-палітычнай дзейнасці яшчэ не завершана. Такое становішча ў многім абумоўлена гістарычным лёсам Беларусі, адсутнасцю вопыту і традыцый жыцця ў плюралістычным, дэмакратычна ўладкаваным грамадстве, перавагай патрыярхальна-падданіцкага тыпу палітычнай культуры, якая характарызуецца нізкім узроўнем палітычнай актыўнасці грамадзян, іх арыентацыяй на моцную дзяржаву і яе моцнага палітычнага кіраўніка як абаронцу і прадстаўніка інтарэсаў [illegible].

Большасць партый пакуль невялікія па колькасці і маюць нязначны ўплыў на вырашэнне праблем грамадства. Адной з галоўных прычын гэтага з'яўляецца страта інтарэсу значнай часткі насельніцтва да палітыкі, адчужэнне яго ад палітычнай сферы, апатыя, пасіўнасць, адсутнасць веры ў пазітыўныя змены ў сваім жыцці. Аб [illegible] даволі яскрава сведчаць вынікі выбараў у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь XIII склікання. Праведзеныя ў чатыры туры выбары так і не выявілі ўладальнікаў 62 дэпутацкіх мандатаў з-за [illegible] ігнаравання выбараў з боку значнай часткі грамадзян. [illegible] у апошнім туры 10 снежня 1995 г. у Мінску ўдзел [illegible] выбаршчыкаў, у Віцебскай вобласці — каля 48%. Падобныя [illegible] характэрны і для іншых абласцей і гарадоў краіны [3].

тычных лідэраў не на сутнасныя інтарэсы канкрэтных класаў і сацыяльных груп, а на ўласныя, далёкія ад патрэбнасцяў людзей, ідэі і ўстаноўкі. Таму ўступленне рабочых, сялян і інтэлігенцыі ў рады партыў і рухаў малакалькаснае. Як паказваюць вынікі розных сацыялагічных даследаванняў, у нашай краіне арыентуюцца на тыя ці іншыя партыі і рухі і актыўна падтрымліваюць іх толькі 10-20% насельніцтва, у той час як у Літве, напрыклад, каля 50% [4, с.7]. Расчараванне ў палітычных партыях падштурхоўвае людзей на пошук новых, непартыйных лідэраў. Невыпадкова ў час выбрання прэзідэнта краіны большасць выбаршчыкаў аддалі свае галасы за А.Р.Лукашэнку, які не быў звязаны ні з адной палітычнай партыяй і балатаваўся як незалежны кандыдат. Аб гэтым сведчаць і вынікі выбараў у Вярхоўны Савет XIII склікання, у якім 95 месцаў, або 48%, атрымалі незалежныя кандыдаты [3].

Акрамя таго, некаторым з новых лідэраў не хапае палітычнага вопыту, дэмакратычнай палітычнай культуры, умення ісці на кампраміс з палітычнымі апанентамі і ўладай для вырашэння актуальных праблем грамадства, своечасова мяняць сваю тактыку ў залежнасці ад эвалюцыі настрояў насельніцтва і змены палітычных умоў. У якасці прыкладу можна прывесці лідэра БНФ З.С.Пазняка, які быў адным з найбольш папулярных палітычных дзеячаў Беларусі ў канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў. Аднак яго нязменны радыкалізм, непрымірымасць у адносінах да палітычных апанентаў і ўлады, няўменне ўлічваць спецыфічныя настроі і менталітэт беларускага насельніцтва прывялі нарэшце да зніжэння папулярнасці і паражэння на апошніх выбарах у Вярхоўны Савет рэспублікі. Характэрна, што і ў шэрагу іншых былых савецкіх рэспублік новыя лідэры, якія прыйшлі да ўлады на хвалі дэмакратызацыі і барацьбы з партыйнай наменклатурай (напрыклад, Ландсбергіс у Літве, Гамсахурдзія ў Грузіі, Эльчыбей у Азербайджане), праз кароткі час павінны былі ўступіць свае кіруючыя пасады былым партыйным і савецкім работнікам, меўшым пэўны вопыт палітычнага і дзяржаўнага кіравання.

Даволі шырокае распаўсюджанне ў палітычнай дзейнасці атрымаў папулізм, які часцей за ўсё грунтуецца на незадаволенасці тых ці іншых сацыяльных слаёў сваім становішчам ва ўмовах глыбокага сацыяльна-эканамічнага крызісу, паніжэння ўзроўню жыцця значнай часткі насельніцтва і выкарыстання гэтай незадаволенасці ў сваіх палітычных інтарэсах. Папулізм абапіраецца на нізкую свядомасць, на грамадскую псіхалогію і эмацыянальны ўзровень успрымання палітычных і сацыяльных працэсаў, нізкі ўзровень палітычнай культуры мас. Нездарма вядомы рускі філосаф І.А.Ільін, аналізуючы праблемы станаўлення дэмакратыі ў краінах, дзе адсутнічаюць дэмакратычныя традыцыі, пісаў: ”Некампетэнтнасць народа — ідэальная глеба для сцвярджэння кар’ерыстаў, авантурыстаў і ўсякага роду месій” [5, с.75]. Папулісцкія тэхналогіі ў той ці іншай меры ў розных выпадках выкарыстоўваюць амаль усе палітычныя лідэры нашай краіны. Галоўнай мэтай з’яўляецца маніпулі-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ванне свядомасцю розных слаёў насельніцтва, схіленне іх на свой бок. Яскрава гэта праяўляецца ў час перадвыбарных кампаній, калі ідзе заляцанне з масамі, вылучаюцца гучныя лозунгі, неабгрунтаваныя абяцанні, якія не маюць пад сабой аб'ектыўнай падставы (напрыклад, у кароткі тэрмін "запусціць" прадпрыемствы, пакончыць з карупцыяй і злачыннасцю, вырашыць складаныя сацыяльныя праблемы і г.д.). Тым самым палітычныя дзеячы імкнуцца заваяваць давер мас і перамагчы на выбарах ва ўладныя структуры.

Адной з асаблівасцяў сучаснага палітычнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца адсутнасць моцнага лідэра цэнтрысцкага плана, які б адказваў інтарэсам асноўных сацыяльных слаёў і груп грамадства, карыстаўся падтрымкай большасці насельніцтва, выконваў ролю аб'ядноўчага цэнтра, пазбягаў крайнасцяў правага і левага напрамкаў у палітыцы. На наш погляд, такое становішча ў многім тлумачыцца сацыяльнай структурай грамадства, якая склалася за апошнія гады. Па даных сацыялагічных даследаванняў Беларускага інстытута інфармацыі і прагнозаў, багатымі людзьмі сябе лічаць 0.7%, беднымі і надта беднымі — 72.1%, 20.2% адносяць сябе да людзей з сярэднім дастаткам [6, с.38]. Асноўная частка насельніцтва, узровень жыцця якога значна панізіўся, арыентуецца на левыя палітычныя сілы. У той жа час "сярэдні клас", які ў заходніх краінах складае больш за 60% і з'яўляецца сацыяльнай базай цэнтрысцкіх партый, у нашай краіне знаходзіцца толькі ў стадыі станаўлення і па колькасці невялікі. Такім чынам, тыя партыі і лідэры, якія прытрымліваюцца на цэнтрысцкія пазіцыі ў палітычным спектры, не маюць зараз дастатковай сацыяльнай апоры і адпаведнай падтрымкі з боку насельніцтва.

Адзначым, што сярод палітычных дзеячаў Беларусі найбольшай папулярнасцю карыстаецца прэзідэнт краіны А.Р.Лукашэнка, які значна апярэдзіў па рэйтынгу іншых палітычных лідэраў. Нягледзячы на сацыяльна-эканамічныя цяжкасці, пагаршэнне жыццёвага ўзроўню большай часткі народа, яго падтрымліваюць 57.8% апытаных, у той час як, напрыклад, З.С.Пазняка — 6.1, С.С.Шушкевіча — 3.7, М.Грыба — 2.9% і г.д.[1]

У выніку падкрэслім, што ва ўмовах складанага працэсу дэмакратызацыі грамадства і фарміравання палітычнага плюралізму ў Беларусі ўсё больш востра адчуваецца аб'ектыўная патрэбнасць у новым тыпе лідэра, які валодае шырокім кругаглядам і кампетэнтнасцю, ураўнаважанасцю цэнтрыста, лічыць галоўным у палітыцы навуковы падыход, ведае рэальныя працэсы і тэндэнцыі грамадскага развіцця, умее пераконваць і весці за сабой людзей.

Дэмакратыя — лепшы "палітычны клімат" для росту сапраўдных палітычных лідэраў, бо функцыянаванне дэмакратычных рэжымаў забяспечвае свабоду дзеяння альтэрнатыўных палітычных сіл,

---

[1] Звесткі паводле вынікаў сацыялагічнага апытання, праведзенага 30 сак. — 10 крас. 1996 г. сацыялагічнай лабараторыяй А. Вардамацкага "Новак" па заказу "Белорусской деловой газеты" [7].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выбару і саперніцтва палітычных лідэраў, а таксама грамадскі кантроль за іх дзейнасцю. Сёння шырокая грамадскасць у большай ступені, чым раней, можа ацаніць погляды і ўчынкі палітычных лідэраў і выдаць мандат на лідэрства, або выказаць недавер.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Политология: Курс лекций / Под ред. В.А.Бобкова, И.Н.Браима. Мн., 1995.
2. Знамя Юности. 1995. 20 дек.
3. Советская Белоруссия. 1995. 12 дек.
4. Становление многопартийной системы в Беларуси / Под ред. В.Карболевича. Мн., 1994.
5. Социально-политические науки. 1992. № 2—3.
6. Беларуская думка. 1996. №3.
7. Звязда. 1996. 20 крас.



### *SUMMARY*

***This article intends to introduce some contemporary issues of political leadership formation and functioning of its institution in the Republic of Belarus.***


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 320+7.01

***Н. П. Шуміла***

# Палітыка і мастацтва

Выявіць узаемасувязь і ўзаемадзеянне палітыкі і мастацтва — задача вельмі складаная. Палітыка ўяўляе сабой перш за ўсё сферу рэалізацыі інтарэсаў розных сацыяльных груп (класаў, нацый, дзяржаў). Мастацтва, як вядома, заўсёды звяртаецца да сацыялізаванага індывіда-асобы.

Паміж мастацтвам і палітыкай здаўна ўстанавіліся даволі трывалыя сувязі. Шмат твораў мастацтва нельга аддзяліць ад палітычнай гісторыі. Пры гэтым сувязь з палітыкай і прамая арыентацыя на яе не перашкаджалі стварэнню высокамастацкіх твораў са старажытных часоў да нашых дзён.

Аднак адзначым: у сувязі палітыкі і мастацтва існуюць не толькі "моманты ўзаемнага прыцяжэння", але і "моманты адштурхоўвання". Не аднойчы ў выніку палітычнай барацьбы ў грамадстве здараўся адыход мастака ад палітыкі. У пачатку XX ст. адзін з буйнейшых прадстаўнікоў рускай філасофскай думкі М. Бярдзяеў у перыяд уздыму рэвалюцыйнага руху сфармуляваў нават ідэю перавагі культуры над палітыкай. Найбольш поўным увасабленнем першай для яго былі мастацтва і рэлігія. Прыгажосць і вышэйшая духоўнасць веры, лічыў філасаф, павінны калі-небудзь назаўсёды забіць "звера